# Метрыка нацыянальнай ідэі

## Круглы стол да 130-годдзя выдання часопіса «Гомон»

Роўна 130 гадоў таму адбыліся падзеі, небывалыя раней. У сталіцы Расійскай імперыі сталі з'яўляцца адзін за адным звароты, адрасаваныя беларускай моладзі і інтэлігенцыі. Іх аўтары вялі гаворку пра лёс свайго народа, паступова фармулявалі лозунг, які потым наш слынны песняр Янка Купала ёміста і геніяльна ўклaдзе ў два словы: «Людзьмі звацца». Найбольш змястоўна гэтыя ідэі былі выкладзены ў двух нумарах нелегальнага часопіса «Гомон» у 1884 годзе. Што мы ведаем пра яго аўтараў? Як іх ідэалогія паўплывала на развіццё нацыянальнай дзяржаўнасці? Увогуле, наколькі дакладныя нашы веды пра карані нацыянальна-дзяржаўнай ідэі? Пра ўсё гэта ішла размова за круглым сталом у рэдакцыі «Беларускай думкі».

**— «Гомон» – з'ява ўнікальная ў айчыннай гісторыі. Для пачатку размовы трэба вызначыцца, чаму гэты па сутнасці палітычны маніфест з'явіўся менавіта ў сярэдзіне 1880-х гадоў і не дзе-небудзь, а ў Санкт-Пецярбургу?**

І. МАРЗАЛЮК: Слушнае пытанне, бо і час, і месца невыпадковыя. Прайшло дваццаць гадоў пасля паўстання 1863 года, змянілася цэлае пакаленне. І нараджаецца з'ява, раней нечуваная. У пачатку 1880-х гадоў выходзяць адозвы беларускіх народнікаў, адна з якіх падпісана псеўданімам «Даніла Баравік», а яшчэ адна – «Шчыры беларус». Нарэшце, з'яўляецца часопіс «Гомон». У гэтых лістах, брашурах, у часопісе прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі сцвярджаюць сам факт існавання свайго народа і яго права на дзяржаўнасць у выглядзе федэрацыі з Расіяй. Абсалютная інавацыя! Гаворка ішла пра дзяржаўнасць менавіта Беларусі, а не ВКЛ альбо, напрыклад, Рэчы Паспалітай. Наша краіна ўяўляецца як асобны суб'ект, які мае роўныя правы, уласную гістарычную традыцыю. Гэта першы крок, што сведчыць аб нараджэнні беларускай нацыі.

Паражэнне паўстання 1863 года для нас, беларусаў, было надзвычай важным. З аднаго боку – былі здзейснены эфектыўныя захады царскай адміністрацыі па дэпаланізацыі заходніх тэрыторый. З другога – пры ўдзеле ўлад беларускай інтэлігенцыяй заходнярускага кшталту была распрацавана новая этнакультурная парадыгма, якая прывяла да іншых трансфармацый. Распачаўся сапраўдны бум этнаграфічных, гістарычных, філалагічных даследаванняў нашых зямель. Хацеў бы зазначыць, што беларуская ідэнтычнасць была ў большай ступені характэрная для жыхароў і інтэлектуальнай эліты ўсходніх рэгіёнаў.

**– А як жа тады Міхаіл Каяловіч, які нарадзіўся, а потым вучыўся на Гродзеншчыне і Беласточчыне?..**

І. МАРЗАЛЮК: Так, Міхаіл Восіпавіч самы што ні ёсць «заходнік». Увогуле цікавая асоба. Ён упершыню стварыў вобраз Беларусі як прыгнечанай палякамі зямлі. Яму належыць канцэпт, што Беларусь – не ў межах Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай губерняў, а «там, дзе ёсць беларуская мова» – так ён казаў у сваіх «Лекцыях па гісторыі Заходняй Расіі». Менавіта заходнярусы сцвярджалі, што этнаграфічным драпежніцтвам з'яўляецца аддаваць каталікоў палякам па прычыне іх канфесіянальнай прыналежнасці. Агульнасць мовы, матэрыяльнай культуры, тэрыторыі, гістарычнага лёсу як нацыянальныя прыкметы – гэта ўсё пастуліравалася менавіта заходнярусамі. Іх ідэі адбіліся ў маладых душах новага пакалення беларусаў.

На жаль, у нашай гістарыяграфіі няма ніводнай работы, прысвечанай падручнікам гісторыі, у тым ліку рэгіянальным, па якіх выкладалі ў гімназіях і школах у той час. Няма манаграфіі пра М.Ф. Турцэвіча – стваральніка тых падручнікаў. Дарэчы, гісторык Міхаіл Далбілаў у сваёй выдатнай манаграфіі «Русский край, чужая вера» паказаў востры канфлікт, які існаваў паміж М.В. Каяловічам і генерал-губернатарам М.М. Мураўёвым. Не ўсё так проста было ў тую эпоху. Але была разбурана сістэма ўзнаўлення традыцыі Рэчы Паспалітай, польскасці як асноўнай гісторыка-палітычнай парадыгмы на нашых землях. Далей адбывалася паглыбленае вывучэнне Беларусі, судакрананне з украінскім нацыянальным рухам, знаёмства з ідэямі федэралізму, якія развіваліся на рускай глебе. Усё гэта паспрыяла ўзнікненню часопіса «Гомон». Гоманаўцы знайшлі саюзнікаў – расійскія рэвалюцыйна-дэмакратычныя сілы. Хаця існавала канцэпцыя «двух ворагаў», яны ўсё ж такі лічылі большым злом Польшчу. Па сутнасці, гэты часопіс заклаў асновы той парадыгмы палітычнай арыентацыі і разумення будучыні, якая з пэўнымі мадыфікацыямі захоўваецца і сёння. Нездарма А.І. Луцкевіч напісаў цэлы шэраг прац, дзе паказваў выключнае значэнне «Гомона» і крытыкаваў «Мужыцкую праўду».

**А. УНУЧАК:** Сапраўды, ён якраз даследаваў гэта пытанне. Цікава, што дзесьці да 1926–1927 гадоў і Луцкевіч, і Ігнатоўскі лічылі «Гомон» газетай, якая выдавалася на беларускай мове ў Мінску. Відавочна, што толькі з перадачай Лявонам Васілеўскім асобнікаў «Гомона» Беларускаму музею імя Івана Луцкевіча ў Вільні адбылося знаёмства з тэкстам.

У беларускай гістарыяграфіі склалася пэўная традыцыя вывучэння «Гомона». М. Ласінскі, С. Самбук у савецкі перыяд паднялі гэту тэму і даследавалі, а С. Александровіч апублікаваў тэксты і раскрыў імёны выдаўцоў (Аляксандр Марчанка і Хаім Ратнер) паводле паліцэйскіх пратаколаў. Увогуле, сам «Гомон» быў знойдзены на пецярбургскай кватэры, якую арандаваў Хаім Ратнер. Там жа былі канфіскаваны гектограф, на якім друкаваўся часопіс, і 32 асобнікі выпуску.

Як жа ўзнік часопіс? Сярод расійскіх народнікаў у Санкт-Пецярбургу афармілася


ГОМОН
Бѣлорусское соціально-революціонное обозрѣніе
№ 1
Содержаніе
От редакціи. | Корреспонденція из Вильны.
Роль мѣстныхъ революц. групп. | " " " Петербурга.
Воззваніе к Бѣлорус. интеллиг. | " " " Кіева.
Воззваніе конституціоналистов. | " " " Витебска.
Общество „освобожд. труда". | " " " Харькова.
- 1884. -

беларуская група, што падтрымлівала ідэі «Народнай волі». І вось якая галоўная думка імі кіравала: «Долой чужие руки! Белоруссия должна быть для белорусов, а не для чужих элементов. Довольно нам подчиняться сильнейшим и ждать, куда нас они поворотят». Тут ясна прасочваецца тэорыя двух ворагаў – Польшчы і царскай Расіі. Ні адну з іх нельга разглядаць як саюзнікаў беларускага руху. Наступная думка – федэралізм і самастойнасць беларусаў. Напачатку трэба было дабіцца самастойнасці беларускай фракцыі ўнутры «Народнай волі», бо і з гэтым былі праблемы, а пазней змагацца за самастойнасць усёй Беларусі. Гоманаўцы пісалі, што, магчыма, у беларускім народзе не падтрымліваецца гэта ідэя, але, відавочна, што і ў расійскім народзе не падтрымліваецца ідэя свабоды. Аднак гэта не значыць, быццам не трэба змагацца за свабоду і федэралізм.

У тэксце «Гомона» мы знаходзім распрацоўку нацыянальнага пытання на вельмі высокім тэарэтычным узроўні. Ёсць там і гістарычная парадыгма. Сцвярджаецца, што ў Беларусі існуе свая інтэлігенцыя, якая павінна змагацца за самастойную Беларусь. Ужываючы тэрмін «беларуская народнасць», рэдакцыя даводзіць – гэта не рускія і не палякі.

У часопісе выкарыстоўваецца руская мова. Меркавалася выдаваць яго на трох мо-



Ігар МАРЗАЛЮК – загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова, доктар гістарычных навук, прафесар



Андрэй УНУЧАК – загадчык аддзела беларускай дзяржаўнасці Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук



Леў КРЫШТАПОВІЧ – начальнік навукова-даследчага аддзела Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар філасофскіх навук, прафесар

вах: на беларускай, рускай і польскай. У тэксце, дарэчы, беларуская мова прысутнічае, таму, у пэўным сэнсе, часопіс можна лічыць двухмоўным.

**– Чаму ён не цалкам на беларускай?**

А. УНУЧАК: Гэта ж быў фактычны зварот да саміх нарадавольцаў. «Гомон» і так абвінавачвалі ў сепаратызме, маўляў: што значыць чужыя элементы? Гэта рускія чужыя элементы? Таму, калі б такія думкі былі выкладзены яшчэ і па-беларуску, то маглі б выклікаць дадатковую негатыўную рэакцыю, нават раскол руху.

Л. КРЫШТАПОВІЧ: Да часу выдання часопіса сапраўды разгарнулася вялікая этнаграфічная, культурная, архіўная праца. Літаральна за 20 гадоў значна ўзбагаціліся веды ўвогуле пра Беларусь, пра беларускі этнас. Фактычна скончылася эпоха польска-шляхецкай інтэрпрэтацыі нашай гісторыі. Пачалі працаваць уласна беларускія даследчыкі. Узгадаць хаця б Е. Раманава, П. Шэйна. Яны фактычна адкрывалі Беларусь для беларускага народа. У выніку і з’яўляецца выданне, якое разлічана на шырокую культурна-асветную дзейнасць.

Заснавальнікам усяго гэтага асветнага працэсу з’яўляецца М.В. Каяловіч – фігура спрэчная. Але ён як ніхто іншы пранік у сутнасць і ментальнасць нашага народа, прадэманстраваўшы менавіта агульнарускія карані. Калі кажуць толькі аб уласна нацыянальным у адрыве ад агульнарускага, то засланяюць шлях да разумення нашай сапраўднай народнасці, нацыянальнай ідэі.

А чаму Пецярбург? Сталіца! Інтэлектуальны цэнтр краіны. У прыватнасці, там працаваў і М.В. Каяловіч у Духоўнай акадэміі.

У. МЕЛЬНІК: Падкрэслю, што нічога гэтага не адбылося б, калі б у канцы XVIII стагоддзя не здарыліся падзелы Рэчы Паспалітай, уз’яднанне беларускіх зямель у адной дзяржаве з рускімі. Не было б «Гомона», не нарадзілася б беларуская ідэя, калі б у 1830, а потым у 1863 годзе не праваліліся польскія паўстанні. Бо мэтай гэтых паўстанняў было вярнуцца да старога – да Рэчы Паспалітай. З’яўленне часопіса звязана менавіта з крытычным пераасэнсаваннем праваленага польскага праекта. Узнікла магчымасць у кантэксце еўрапейскіх палітычных плыняў асэнсавання і расійскай, і мясцовай інтэлектуальнай элітай зместу новага канцэпту нацыі, які і падказаў, што мы – народ. І не горшы за астатніх, і мы маем права самаарганізавацца, назвацца нацыяй з усімі наступствамі, што адсюль вынікаюць: правам на самавызначэнне, на ўзаемадзеянне з іншымі. Таму і ўзнік праект аб’яднання ў федэрацыю з дэмакратычнай Расіяй, але ў якасці самастойнага народа, які сам гаспадар свайго лёсу.

У гоманаўцаў былі непаразуменні з нарадавольцамі. Хоць трэба адзначыць і пэўны рэвалюцыйны экстрэмізм «Гомона»: цяпер гэта не ўласціва беларускай нацыі. Некаторыя цытаты, накіраваныя супраць іншых народаў, могуць выклікаць і непатрэбныя трактоўкі. Але з’яўленне часопіса, канешне, уражвае. Бачна адукаванасць аўтараў, яны вельмі добра інфармаваныя пра еўрапейскую палітычную думку, карыстаюцца яе дасягненнямі. А тое, што часопіс выдадзены ў Пецярбургу, натуральна. Там навучаліся беларусы, якія імкнуліся дапамагчы свайму народу, выкарыстоўваючы атрыманыя веды. Трэба падкрэсліць, што «Гомон» цесна звязваў вырашэнне «беларускага пытання» з агульнымі мэтамі рускай рэвалюцыі.

А. ДЗЕРМАНТ: І да «Гомона» былі пэўныя спробы падступіцца да «беларускай ідэі», але яны аказаліся безвыніковымі. Напрыклад, тая ж «Мужыцкая праўда» не прынесла ніякага плёну. Ішлі спрэчкі, з кім быць: з Расіяй альбо з Польшчай? І «Гомон» стварыў праект, найбольш удалы, з майго пункту гледжання. Яны знайшлі пэўную залатую сярэдзіну. Па-першае, звязалі нацыянальнае пытанне з сацыяльнай мадэрнізацыяй. Да таго часу і ў інтэлігенцыі, і нават у сялянскай масе, з якой і выйшла новая беларуская інтэлігенцыя, ужо саспелі гэтыя нацыянальныя пачуцці. Па-другое, быў зроблены найбольш аптымальны геапалітычны выбар – саюз з Расіяй. Гісторыя XIX стагоддзя паказала, што антырасійскі шлях вядзе ў тупік. Такім чынам, у выніку пэўнай эвалюцыі атрымаўся самы ўдалы праект. XX стагоддзе паказала, што менавіта такія праекты найбольш паспяховыя для пабудовы нацыянальнай дзяржавы. Першае – гэта сацыяльныя патрабаванні, другое – прызнанне самабытнасці беларусаў, трэцяе – злучэнне з Расіяй на роўных пачатках. Гэтыя пункты былі закладзены як маркёры паспяховасці беларускага праекту.

**– Вы гаворыце пра ўплыў заходнерусізму. Аднак яго прадстаўнікі прытрым-**

**ліваліся, у асноўным, манархічных поглядаў, былі кансерватарамі альбо лібераламі. Выдаўцы ж «Гомона» абвясцілі сябе «Беларускай сацыял-рэвалюцыйнай групай», паслядоўнікамі Ігната Грынявіцкага, забойцы цара Аляксандра II. Ці няма тут супярэчнасцей?**

Л. КРЫШТАПОВІЧ: Заходнерусізм нельга трактаваць у чыста манархічным плане. Паводле Каяловіча – гэта культурна-гістарычнае і філасофска-ментальнае асэнсаванне таго этнасу, які жыве на тэрыторыі Беларусі. Ён піша, што беларусы – нашчадкі старажытнарускага народа. У яго можна нават прасачыць ноткі праваслаўнага сацыялізму. Каяловіч піша, што ментальныя інтэнцыі, характэрныя для нашага народа, нельга экстрапаліраваць на вялікарасійскую рэчаіснасць. Напрыклад, праваслаўе ў Расіі заўжды было пануючай рэлігіяй. У Беларусі ж працяглы перыяд праваслаўныя былі ў прыгнечаным стане. Гэта і накладвала свой адбітак на фарміраванне беларускай свядомасці. І ў такім разуменні свайго народа заходнярусы і гоманаўцы вельмі падобныя.

У палітычным плане «Гомон» рэзка крытычны да расійскага самаўладдзя. Таму беларускія рэвалюцыянеры супрацоўнічалі з іншымі. З тым жа Грынявіцкім – польскім шляхціцам.

А. УНУЧАК: Я не магу пагадзіцца з гэтым меркаваннем. Нельга ўвогуле гаварыць пра ўплыў заходнерусізму на часопіс «Гомон». Дарэчы, прозвішча Каяловіча ўзгадваецца ў тэксце двойчы і абодва разы ў негатыўным сэнсе. Нават кажуць, што ён шпігуе за выдаўцамі «Гомона». Наконт свядомасці Грынявіцкага мы маем толькі сведчанне нарадавольца Ціхамірава, што той называў сябе ліцвінам. Нарадзіўся ён у Бабруйскім павеце Магілёўскай губерні. Большую частку жыцця пражыў на Беласточчыне, непадалёк ад родных мясцінаў Каяловіча. Свой тастамент Грынявіцкі напісаў на рускай мове. У гэтым сэнсе нарадавольцы, якія выдавалі «Гомон», адназначна мелі прыхільнае стаўленне да Грынявіцкага.

І. МАРЗАЛЮК: Блізкасць гоманаўцаў да заходнерусізму – у канцэптуальным бачанні мінулага і будучага Беларусі. Пасля паўстання 1863 года ўлады праводзілі палітыку, якая праз кароткі прамежак часу выклікала, дарэчы, абурэнне самога імператара. Гэта тычылася гвалтоўнага пераводу ў праваслаўе каталікоў. Не ўсе ж каталікі мелі польскую ідэнтычнасць. Больш за тое, многія ўпісвалі ўласную традыцыю ў рускую, але такіх была мізэрная колькасць. Дарэчы, заходнерусізм заснаваў не праваслаўны чалавек, а каталіцкі біскуп Богуш-Сестранцэвіч, нават тэрмін гэты ўвёў.

На жаль, у нас няма грунтоўных гістарычных работ па канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя. Гэты перыяд добра не даследаваны. Трэба больш працаваць з крыніцамі. І тады мы ўбачым, што ёсць два розныя Каяловічы. Адзін афіцыйны, а другі – у ягоным ліставанні, напрыклад, з Аксакавым. Ён абураўся палітыкай Мураўёва, які замест агульнарускай справы насаджаў велікарускую.

У выніку напружанага супрацьстаяння польскай і рускай ідэй на Беларусі сустрэліся дзве плыні. З аднаго боку – пакрыўджаныя прадстаўнікі мясцовай праваслаўнай інтэлектуальнай эліты, з другога – расчараваная ў Польшчы дробная шляхта, якая тут змагалася за польскую справу, але ёй пастаянна давалі зразумець і ў Варшаве, што яны – «палякі другога гатунку». Для іх заходнерусізм падрыхтаваў гатовую канцэпцыю вялікага мінулага Беларусі, даў усе аргументы. Гоманаўцы пішуць: «Наша интеллигенция выходит обыкновенно из паразитного класса поляков-помещиков или из бюрократии различных религий. Шляхетские замашки и бюрократический произвол здесь получают самый острый характер, самый широкий простор. Здесь отсутствует все, что хоть сколько-нибудь могло бы смягчить отторжение культурного слоя к народу. Ни национальных исторических традиций, ни земского самоуправления, ни новых судов… Отсюда то преобладающее презрение этого слоя к народу и так резко бросающаяся в глаза беспочвенность интеллигенции. Ни громадную ли услугу может сделать интеллигенция, в которой так будет нуждаться народ при освоении новых начал общественной жизни после переворота, если эта интеллигенция станет заранее ближе к понятиям и потребностям народа».

У. МЕЛЬНІК: Агульнае ў гоманаўцаў і заходнерусістаў тое, што яны выходзілі з прызнання самабытнасці беларускага народа. Дарэчы, поўнасцю праект гоманаўцаў не быў рэалізаваны, як і праект заходнерусістаў. Што тычыцца Грынявіцкага, то гэта вельмі супярэчлівая фігура. Калі я вучыўся ў школе,



Аляксей ДЗЕРМАНТ – навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі



Уладзімір МЕЛЬНІК – прафесар кафедры філасофскіх навук і ідэалагічнай работы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук, прафесар

нам гаварылі пра яго як героя. А цяпер мы разумеем, што гэта быў тэрарыст, і такія метады палітычнай барацьбы наўрад ці можна вітаць.

А. ДЗЕРМАНТ: Унікальнасць беларускага кантэксту ў тым, што ў нас розныя з'явы спалучаюцца і даюць плён. Класічныя пастулаты заходнерусізму ў гэты час не маглі рэалізавацца, бо апелявалі да найбольш кансерватыўнай і ліберальнай плыняў. Атрымліваецца, што адзіны варыянт выйсця нацыянальнатворчай энергіі пралягаў у сацыял-рэвалюцыйным руху. І гэты рух перасягаў культурныя бар'еры. З'яўленне такіх людзей, як Грынявіцкі, як бы да яго ні ставіцца, сведчанне таго, што гэты сінтэз існаваў і працаваў. Энергія, ідэйна абуджаная гаманаўцамі, трансліравалася на людзей, якія па розных прычынах уключаліся ў гэты рух, і ён пашыраўся.

**– Усё ж трэба паставіць і такое пытанне. Наколькі часопіс «Гомон» быў уплывовы? Невялікая група студэнтаў-народнікаў, маленькі тыраж... Ці сапраўды праца гаманаўцаў дала нейкі плён?**

І. МАРЗАЛЮК: Ёсць розныя думкі на гэты конт. Адны лічаць, што «Гомон» увогуле ніякім чынам ні на што не паўплываў. Напрыклад, сучасны даследчык Валер Булгакаў сцвярджае, што выводзіць пачаткі беларускага нацыягенезу ад «Гомона» няма сэнсу, а можна толькі ад Багушэвіча. Але ў Багушэвіча не было ніякай палітычнай праграмы, ніякага вобраза будучыні, толькі апеляцыя да мінулага і да мовы. Гоманаўцы ж прапанавалі першы беларускі нацыянальны праект у поўным сэнсе гэтага слова. У Каліноўскага такога праекта таксама не было. У гэтым сэнсе цікавая негатыўная рэцэнзія Антона Луцкевіча на спробы Адама Станкевіча стварыць вобраз Каліноўскага як першага беларускага нацыянальнага дзеяча. Паводле Луцкевіча, тут увогуле няма пра што казаць, бо Каліноўскі працаваў у агульнапольскім кантэксце. Ён смяяўся з тых, хто лічыў «Мужыцкую праўду» першай беларускай газетай.

На маю думку, «Гомон» рэальна паўплываў на беларускі палітычны дыскурс аж да 1918 года. Па сутнасці, усе канцэпцыі нашаніўскай пары і палітычныя праграмы Беларускай сацыялістычнай Грамады паўтаралі асноўныя моманты «Гомона»: самабытнасць плюс федэралізм у складзе Расійскай імперыі. Мы бачым апеляцыю да дэмакратычных сіл Расіі, імкненне знайсці ў іх падтрымку. У свой час А. Луцкевіч пісаў, што найгоршым з'яўляецца развал Расіі і сепаратызм, падтрымліваў фэдэралізм. Гэта быў рэалістычны погляд. Магілёўскі гісторык Д. Лаўрыновіч паказаў, што Луцкевіч меў добрыя адносіны з Мілюковым, партыя якога (кадэты) фінансавала «Нашу ніву». Акрамя таго, у рускамоўным друку Луцкевіч выступаў пад псеўданімам і тлумачыў, што беларуская справа карысная для Расіі, бо накіравана супраць польскага ўплыву. У 1918 годзе, у сувязі з прыходам да ўлады бальшавікоў, сітуацыя змянілася. Але калі была абвешчана БССР, той жа Луцкевіч напісаў, што мэты руху дасягнуты, а ў 1939 годзе вітаў уз'яднанне Беларусі.

У. МЕЛЬНІК: Я таксама больш схіляюся да таго, што «Гомон» меў уплыў. Але вось пытанне: наколькі вялікі? Як працаваў механізм гэтага ўплыву? Хто чытаў асобныя экзэмпляры? Янка Купала, напрыклад, чытаў? Як гоманаўцы пранікалі ў свядомасць свайго пакалення? Не ведаю! Ці проста сам «Гомон» гэта не інструмент уплыву, а адлюстраванне шырокіх грамадскіх настрояў?

І. МАРЗАЛЮК: Сапраўды, важна тое сацыяльнае асяродзе, у якім выкрышталізоўваліся ідэі гоманаўцаў. Гэта і інтэлігенцыя, новая разначынная, і новае мяшчанства, якое атрымлівала вышэйшую адукацыю ўжо ў рускіх універсітэтах. І ў гэтых колах, як сведчыць Адам Багдановіч, бацька паэта Максіма Багдановіча, цыркуляваў «Гомон». Ведалі яго і ў Мінску.

У. МЕЛЬНІК: Гэта пацвярджае, што такія ідэі авалодалі розумам многіх. Сам «Гомон» – метрыка, пісьмовае сведчанне пра нараджэнне беларускай нацыянальнай ідэі.

А. ДЗЕРМАНТ: Давайце вернемся да месца, дзе гэта адбывалася – Санкт-Пецярбург. Там сапраўды існавалі сталыя беларускія групоўкі, свой асяродак. Узгадаем таго ж Язэпа Канчара, кіраўніка Беларускага абласнога камітэта ў 1917 годзе, які будаваў сваю праграму фактычна на тых жа ідэях «Гомона». І калі мы хочам адказаць на пытанне, ці быў уплыў, то трэба проста параўнаць тэксты і праграмы, і ўсё стане зразумелым. Хоць канцэпцыя, сапраўды, магла перажываць пэўную эвалюцыю.

Л. КРЫШТАПОВІЧ: Тое, што «Гомон» паўплываў на фарміраванне беларускай нацыянальнай свядомасці – несумненна. І ў той жа час ён быў вынікам з'яўлення

новых сацыяльных сіл у беларускім грамадстве. Менавіта гэта было народнай з'явай. Таму я і лічу, што тыя працэсы звязаны з заходнерусізмам, які таксама ішоў з народных глыбінь.

**– І ўсё ж прычынай з'яўлення новай беларускай свядомасці сталі спецыфічныя этнакультурныя ці сацыяльна-палітычныя працэсы, уласцівыя ўсяму расійскаму грамадству? Нагадаю думку Леніна, які пісаў, што на змену дваранскаму этапу рэвалюцыйнага руху прыйшоў разначынны.**

Л. КРЫШТАПОВІЧ: Дваранская хваля ў Расіі была сваёй, нацыянальнай, рускай. На беларускіх землях яна была польскай, іншанацыянальнай – у гэтым спецыфіка. Чыста беларуская інтэлігенцыя з'яўляецца толькі ў канцы XIX стагоддзя. Яна была яшчэ кволай. Таму мы спрачаемся пра ступень уплыву «Гомона». Але гэта была ўжо свая інтэлігенцыя, якая атрымала адукацыю ў расійскіх універсітэтах, таму і «Гомон» выдаваўся ў Пецярбургу, а не ў Варшаве і не ў Вільні. Пачынаецца новая эпоха з новымі цэнтрамі. Спецыфіка гоманаўцаў у тым, што яны выступаюць выразнікамі нацыянальнай самасвядомасці, якая нічога агульнага не мае з польска-шляхецкімі коламі. І паглядзіце: гоманаўцы – гэта не нацыяналісты, а людзі, якія імкнуцца знайсці свой шлях у згодзе з іншымі народамі. Чаму сучасныя нацыяналісты не звяртаюцца да «Гомона»? Таму што ў іх іншыя карані, нават не беларускія, а тыя самыя – польска-шляхецкія.

А. УНУЧАК: У свой час М.С. Сташкевіч даў мне на выбар дзве навуковыя тэмы: адна – «Наша ніва», а другая – беларускія народнікі. Я выбраў «Нашу ніву», але таксама займаўся і народнікамі. І ў гэты час бачыў лісты А. Луцкевіча да А. Багдановіча ад 1927 года з Польшчы ў СССР. Ён піша, што для беларускіх народнікаў, якія жылі ў Мінску, нацыянальнае пытанне стаяла на дзясятым месцы. Само пытанне пра федэралізацыю ў такіх умовах было вельмі радыкальным. Таму і гаварыць пра прамы ўплыў «Гомона» ў нас няма дастатковых падстаў.

Мы дакладна ведаем, што паліцыя знайшла 32 экзэмпляры першага нумара. Вельмі складана казаць пра нейкі непасрэдны ўплыў часопіса. Мы не бачым механізму трансляцыі тэксту – проста не выяўлена. Часопіс не цытуецца ў «Нашай ніве». Але самае істотнае, што ва ўспамінах, перапісцы таго перыяду згадкі пра «Гомон» мы не сустракаем аж да Першай сусветнай вайны. Калі нехта знойдзе, то гэта будзе вялікім адкрыццём.

І. МАРЗАЛЮК: Хачу адказаць. Калі мы бяром найважнейшыя элементы традыцыі: гістарычную канцэптуалістыку, вобраз будучыні, акрэсліванне «вораг-сябар», то бачым поўную пераемнасць з нашаніўскім перыядам і наступнай рэвалюцыйнай эпохай. Адмаўляць уплыў наўрад ці магчыма. Пра існаванне «Гомона» ў Мінску ведалі. І А. Багдановіч ведаў пра яго са слоў мінскіх і віцебскіх народнікаў. Іншая справа, ці чытаў ён яго сам, бо лічыў, што «Гомон» быў беларускамоўным выданнем.

І трансляцыя традыцый у народніцкім асяроддзі таксама была. Гоманаўцы ў другім нумары змясцілі адказ на крытыку з боку рускіх народнікаў за нацыяналізм. Самае цікавае, што нацыяналістамі ў вузкім этнічным сэнсе слова іх назваць нельга, бо ў іх ёсць цэлы раздзел пра тое, як яны разумеюць нацыянальнасць і чым іх светапогляд адрозніваецца ад «узкого сепаратизма» – гэта іх словы. Яны разумеюць нацыяналізм буржуазных класаў як інструмент для дамінацыі больш моцнай нацыі. Гоманаўцы выступаюць супраць нацыянальных інтарэсаў ротшыльдаў і паляковых, як яны пішуць. Для іх галоўнае – палітычная свабода, неабходная для самарэалізацыі ўсяго народа. Усталёўваецца сувязь нацыянальнага з сацыяльным. І яшчэ іх адрознівае разуменне, што нацыя не павінна растварыцца ў сучаснай цывілізацыі, яны выступаюць за захаванне «асобы народа»: «Всякая нация, как бы она слаба ни была, заслуживает полного признания самостоятельности, и всякую попытку со стороны другой нации подавить эту слабую соседку следует признать вредной, под каким благовидным предлогом она ни происходила бы, не только для этой слабой нации, но и для самой угнетательницы». Яны лічаць, што могуць знайсці саюзнікаў сярод сваіх калег-народнікаў: «Вот какого взгляда мы держимся относительно национального вопроса. В силу этого взгляда считаем необходимым энергично защищать Белоруссию как от польского, так и от великорусского насилия, которое та и другая сторона обязывается облачить в мягкую форму благодетельного будто бы для Белоруссии культурного взаимодействия и

покровительства». Яны заяўляюць пра правы беларускага народа, але не пад лозунгам нацыяналізму.

Л. КРЫШТАПОВІЧ: Шмат у чым такія фармулёўкі – даніна тагачаснай тэрміналогіі, палітычнай і сацыяльнай.

У. МЕЛЬНІК: Зразумела, яны ж яшчэ не валодалі пазнейшымі напрацоўкамі пра тое, што такое нацыя, нацыянальная дзяржава.

І. МАРЗАЛЮК: Можна пагадзіцца з даследчыцай С. Самбук, што якраз народнікі і гоманаўцы ў сваім разуменні нацыі наблізіліся да больш позняй савецкай трактоўкі. Дарэчы, Беларусь яны лічылі «молодой плебейской нацией». І яшчэ цытата з «Гомона»: «Свободная от изношенного хлама, исторических традиций и воспитанная на критике чуждых культур белорусская интеллигенция более всего способна возвыситься современных задач общечеловеческого прогресса». Прарыў да зорак! Але з сарказмам дадавалі: «Правда, у ней не будет того бессознательного узкого национализма, который называется обыкновенно «духом», у ней не будет белорусского «духа», зато она будет проникнута созидательным народничеством, которое во всяком случае лучше всех эти прирожденных национальных преданий уже по одному тому вредных, что заключают много ненужного старья». Які тут нацыяналізм?!

**– Давайце сфармулюем значэнне «Гомона» для беларускай гісторыі. На маю думку, нават сам факт таго, што часопіс выдаваўся праваслаўным беларусам А. Марчанкам і яўрэем Х. Ратнерам, якія аднолькава клапаціліся пра будучыню свайго краю, шмат пра што гаворыць. Гэта фактычна прадвеснік нараджэння беларускай палітычнай нацыі.**

У. МЕЛЬНІК: Я прапаноўваю не блытаць беларускую нацыянальна-дзяржаўную ідэю з проста ідэяй. Мы, беларусы, ёсць нацыя ў новаеўрапейскім сэнсе гэтага тэрміна. Таму мы маем права распараджацца сваім лёсам. Старое разуменне нацыі вузкаэтнічнае – племя, род з пэўнай мовай. Новае – гэта канцэпт, палітычная супольнасць на пэўнай тэрыторыі, поліэтнічная па сваёй сутнасці. Гоманаўцы сталі ў гэтым сэнсе наватарамі. Яны выпісалі метрыку беларускай палітычнай нацыі. Яны таксама выступілі за федэрацыю з Расійскай дэмакратычнай рэспублікай. Паглядзіце, гэта ж актуальна! Нават у кантэксце сучаснай інтэграцыі.

Л. КРЫШТАПОВІЧ: Дарэчы, у «Гомоне» гаворыцца не пра нацыянальную, а пра цывілізацыйную ідэю. Выдаўцоў хвалявалі не вузкія мястэчковыя праблемы, а ўся агульная руская прастора, прытым, што яны разумеюць сваю самабытнасць. «Гомон» – гэта адзін з этапаў фарміравання ідэі беларускай дзяржаўнасці.

А. УНУЧАК: Актуальнасць – слушнае пытанне. На мой погляд, не варта так проціпастаўляць Каліноўскага і «Гомон». Каліноўскі – больш вядомы ў нашай гісторыі. Ён таксама прадстаўляў этап на шляху нацыянальнага вызначэння Беларусі. Гоманаўцы імкнуліся сфармуляваць беларускую палітычную думку і данесці яе да расійскай рэвалюцыйнай эліты. Відавочна, што яны гэтага дамагліся. Наколькі яны данеслі да беларускай інтэлігенцыі – тут больш пытанняў. Хоць факт такога апасродкаванага, ускоснага ўплыву нельга адмаўляць.

Але важны яшчэ адзін аспект. Без дасягнення свабоды ў Расіі немагчыма дасягненне мэт «Гомона». Што рабіць, калі свабоды не будзе ў Расіі? Калі Расія не будзе дэмакратычнай? Гоманаўцы верылі, што будзе, і ў гэтым мне бачыцца іх гістарычная абмежаванасць. Потым і БСГ, і Усебеларускі з’езд выступалі ў гэтым федэралісцкім рэчышчы – фактычна з праграмай «Гомона». І толькі ў 1918 годзе стала зразумела, што трэба змагацца за незалежнасць Беларусі.

І. МАРЗАЛЮК: «Гомон» стаў шмат у чым вынікам вялікага і складанага працэсу інстытуіравання беларускай свядомасці ў XIX стагоддзі. Пачатак гэтага працэсу – падзелы Рэчы Паспалітай, без якіх не было б Беларусі. Паглядзіце, у 1850-я гады расійскія губернатары зусім сур’ёзна абмяркоўвалі пытанне ўвядзення беларускай мовы ў школах. Гэта сведчыла аб тым, што ішоў інтэлектуальны працэс на Беларусі. А так бы і «Гомона» не было! Для гэтага была неабходна ліквідацыя Рэчы Паспалітай. Калі спачатку аслабеў, а потым быў зламаны механізм трансляцыі высокай польскай культуры. Чым большым быў прэс русіфікацыі на нашай тэрыторыі, тым большы шанц для ўкаранення набывала беларуская самасвядомасць. Русіфікацыя на нашых землях была накіравана супраць пальшчызны, а не беларушчыны.




**А. ДЗЕРМАНТ:** Ключавое слова – традыцыя. «Гомон» – гэта пачатак новай беларускай палітычнай традыцыі, якая адрознівалася ад іншых этнанацыянальных канцэпцый. Па-першае, яна не апелявала выключна да мовы як асноўнай нацыянальнай прыкметы. Па-другое, рабіла акцэнт на сацыяльным аспекце. Менавіта гэта чырвонай ніткай ідзе праз усё XX стагоддзе аж да нашага часу. У нас няма этнакратычнай формы пабудовы дзяржаўнасці. Нават тое, што мы ў Канстытуцыі запісалі і, галоўнае, выконваем гэта – сацыяльная дзяржава – вынік дзеяння той матрыцы, якая закладвалася яшчэ пры «Гомоне». І адпаведны крытыцызм да алігархічнага капіталізму.

**– Нават у ходзе нашага круглага стала стала відавочным, што мы многага не ведаем пра гісторыю станаўлення ідэі беларускай дзяржаўнасці. Якія лакуны трэба яшчэ запоўніць гістарычнай навуцы ў гэтым кірунку?**

**А. УНУЧАК:** У нас добра даследаваны сацыялістычны рух, чаго не скажаш пра хрысціянска-дэмакратычны. Гэта белая пляма ў нашай гістарыяграфіі.

**І. МАРЗАЛЮК:** На жаль, самая вялікая загана і слабасць – нізкая даследаванасць дакументальнай базы па гісторыі Беларусі. У нас ёсць археаграфічная камісія, але ў яе няма фінансаў. Нам патрэбна пастаянна дзеючая Нацыянальная археаграфічная камісія, з асобным сектарам гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Варта пераводзіць у лічбавы фармат дакументы, каб мы ў Мінску мелі копіі. Гэта праца на некалькі дзесяцігоддзяў. Трэба стварыць адпаведную дзяржаўную праграму. Паколькі большая частка дакументаў знаходзіцца ў Расіі, то, магчыма, спатрэбіцца праграма Саюзнай дзяржавы. Мы дайшлі да таго, што ў Расіі цяпер выходзіць больш даследаванняў па беларускай і ўкраінскай ідэнтычнасці, чым у нас.

**Л. КРЫШТАПОВІЧ:** Дадаў бы, што нам патрэбна сучасная і адпаведная метадалогія, філасофскае разуменне беларускага быцця, нацыянальнага кантэксту.

**А. ДЗЕРМАНТ:** Важна вяртаць пласты гісторыі праз персаналіі. Стварыць нацыянальны пантэон, а таксама гістарычны каляндар, каб мы ведалі найбольш значныя даты. Мне здаецца, нам гэтага не хапае.

**У. МЕЛЬНІК:** Гэта праблематыка, асабліва з улікам падзей ва Украіне, вельмі актуальная. Шмат якія пытанні трэба асвятляць з новых пазіцый. Неабходна папулярызаваць тыя падзеі і з'явы, па якіх даследчыкі ўжо дасягнулі паразумення, згоды. І даводзіць гэту інфармацыю да самых шырокіх колаў насельніцтва, уносіць папраўкі ў падручнікі. Я лічу, што патрабуе карэкціроўкі і тэрмін у прэамбуле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Зараз там запісана: «абапіраючыся на шматвекавую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці», але больш слушна – «на шматвекавую гісторыю беларускага народа». Бо пачатак нашай дзяржаўнасці – студзень 1919 года. І гэта ніяк не абражае наш старажытны народ.

**Круглы стол правёў Вадзім ГІГІН**